# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ РАДЗІННЫЯ ЗВЫЧАІ І АБРАДЫ БЕЛАРУСАЎ



**Таццяна Кухаронак,**
старшы навуковы супрацоўнік аддзела нарадазнаўства Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

У межах сацыяльных і культурных працэсаў, якія адбываюцца ў XXI ст., актуальнасць ведаў аб культурных здабытках набывае новае значэнне і ўносіць змены ў іх функцыянаванне. Спадчына для сучаснага грамадства складае духоўны патэнцыял нацыі, аснову яе культурнай разнастайнасці і самабытнасці, выступае канстантай сацыякультурнай дынамікі і базай устойлівага развіцця. Звычаі, абрады, песні, веды і навыкі, звязаныя з нараджэннем і выхаваннем дзяцей, таксама належаць да нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Так, спеўная традыцыя выканання хрэсьбінных і вясельных песень в. Паршына Горацкага раёна Магілёўскай вобласці атрымала статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

У традыцыйным беларускім грамадстве працяг роду лічыўся натуральным і галоўным прызначэннем сям'і, дзеці ўспрымаліся як Божы дар, блаславенне, бяздзетнасць жа разглядалася як няшчасце (*мал. 1*). Паводле міфалагічных уяўленняў нашых продкаў, дзяцей прыносіў бусел або іншыя птушкі ці жывёлы – як дзікія, так і хатнія (*мал. 2*).



*Мал. 1.* Сялянка Малочка Н.І. з дзіцем, в. Морач, Клецкі раён, Мінская вобл. Фота Л. Малчанавай, 1958 г. З архіва ІМЭФ НАН Беларусі

Комплекс традыцыйных радзінных звычаяў, абрадаў, магічных прыёмаў, вераванняў склаўся з трох узаемазвязаных цыклаў: перадродавага, родавага і пасляродавага. Першы цыкл уключаў у сябе звычаі, вераванні, абрадавыя дзеянні, закліканыя забяспечыць наогул дзетанараджэнне ў шлюбнай пары, зачацце дзіцяці і захаванне цяжарнасці. Ад абставін, якія папярэднічалі зачаццю, і паводзін цяжарнай жанчыны, паводле народных уяўленняў, залежалі знешнасць, здароўе, характар і нават само жыццё будучага дзіцяці. Забаранялася зачынаць дзяцей у пераломныя моманты гадавога кола, у вялікія святы, а таксама ў перыяды пастоў. Нядобрымі для зачацця днямі былі таксама посныя дні – серада і пятніца – і кануны гэтых дзён, бо, згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі беларусаў, дзіця магло нарадзіцца непаўнавартым, што не дазваляла яму ў будучым выконваць сацыяльна-гендэрныя ролі. Імкнуліся таксама пазбягаць зачацця ў стане алкагольнага ап’янення, таму традыцыйна на вяселлі жаніх і нявеста не пілі гарэлкі.

У беларускага народа меўся цэлы звод прадпісанняў і забарон, накіраваных на ахову плода ва ўлонні маці. Асабліва гэта тычылася першай паловы цяжарнасці. Большасць з гэтых уяўленняў былі заснаваны на шматгадовых жыццёвых назіраннях і адрозніваліся вялікім практычным зместам. Цяжарная жанчына асцерагалася ўдараў у жывот, у час цяжкіх палявых работ падвязвала яго ручніком або хусткай, не сцягвала моцна спадніцу і інш. Лічылася, што жанчына павінна есці ўсё, што жадае («чаго душа просіць»), але ў меру.

У традыцыйнай культуры дародавыя забароны і рэкамендацыі былі заснаваны галоўным чынам



*Мал. 2.* Буслы, што прыносяць дзяцей. Фота Т. Кухаронак

на перакананні, што падобнае выклікае падобнае. У час цяжарнасці жанчыне забаранялася глядзець на пажар, а калі не было іншага выйсця, то нельга было, спалохаўшыся, дакранацца рукамі да свайго цела, бо лічылася, што ў дзіцяці ў адпаведным месцы застанецца вогненная радзімая пляма. Перасцерагалі жанчыну прысутнічаць на пахаваннях, глядзець на нябожчыка, бо ў дзіцяці магла быць цяжкая хвароба ці жоўты хваравіты колер твару. Таксама забаранялася сядзець на камяні – роды будуць цяжкія, пераступаць праз вяроўку, вязаць, плесці – дзіця можа заблытацца ў пупавіне. Нельга было зашываць адзенне на сабе – будуць цяжкія роды, спяшацца пры размове – дзіця будзе заікацца, падстрыгаць валасы, каб «не ўкараціць дзіцяці розум», і г.д. Каб дзіця не нарадзілася калекам, паўсюль на Беларусі цяжарным забаранялася працаваць у рэлігійныя святы і ў пэўныя перыяды каляндарнага года: калядныя вечары, велікодны і траецкі тыдзень. Іх засцерагалі ад усяго, што магло выклікаць у іх адмоўныя эмоцыі, такія як жах, гнеў, крыўда, прыкрасць, злосць.

Большасць павер’яў і ўяўленняў, звязаных з цяжарнасцю, сучасныя маладыя жанчыны засвойваюць у сям’і ад сваіх маці і бабуль або ад сваіх сучасніц. Сёння паўсюдна ў вясковым соцыуме найбольш актуалізаваны наступныя павер’і: не глядзець на пачварных людзей, «страшныя фільмы» па тэлебачанню, не працаваць у рэлігійныя святы, не глядзець на пажар, не прысутнічаць на пахаванні і інш.

Былі прыкметы для вызначэння полу будучага дзіцяці. Паводле народнага меркавання, калі ў хату, у якой знаходзілася цяжарная, на вялікае свята зойдзе першым мужчына, то ў яе народзіцца сын, калі жанчына – дачка. Лічылася: калі першае варушэнне плода адчувалася ў правым баку – прадказвалі нараджэнне хлопчыка, калі ў левым – дзяўчынкі; калі ў цяжарнай твар быў чысты, ярка-чырвоныя шчокі, выпуклы жывот – чакалі нараджэння хлопчыка, калі ж твар у плямах, бледны, жывот пляскаты – дзяўчынкі.

Роды, асабліва першыя, успрымаліся як адзін з самых важных псіхафізічных момантаў, звязаных з якаснай зменай стану і статусу не толькі самой жанчыны, але і яе сям’і: жанчына станавілася маці, яе муж – бацькам, яе і мужа бацькі – бабулямі і дзядулямі. Дапамагала пры родах баба-павітуха, у якой быў багаты вопыт і практычныя веды па акушэрстве. Акрамя чыста ўтылітарных акушэрскіх функцый кожная

бабка-павітуха выконвала цэлы шэраг магічна-абрадавых дзеянняў, якія маглі паўплываць на будучы лёс і характар чалавека. Меўся ў кожнай павітухі і спецыяльны ручнік, неабходны падчас родаў (*мал. 3*). У кожнай вёсцы была хоць адна свая павітуха, а ў вялікіх – дзве ці тры. У тагачасных умовах яна з'яўлялася не толькі акушэркай і дзіцячым лекарам, але і дарадчыцай парадзіхі, і памочніцай ёй па гаспадарцы ў першыя дні пасля родаў. Адсюль тая павага да бабкі-павітухі, асабліва калі яе майстэрства знаходзіла пастаяннае пацвярджэнне ў паспяховым зыходзе родаў.



*Мал. 3.* Радзінны ручнік з Магілёўшчыны. Фота Т. Кухаронак

Паўсюль на Беларусі пупавіну хлопчыку пераразалі на нажы, сякеры, малатку, дубовай кары, кніжцы, а дзяўчынцы – на грэбні, верацяне, нітках, кручках, нажніцах. Згаданыя рытуальныя дзеянні ўстанаўлівалі сімвалічную сувязь са сферамі, у якіх павінна была праходзіць гаспадарчая, сямейная і грамадская дзейнасць мужчыны і жанчыны, вызначалі дыферэнцыяцыю працы ў залежнасці ад полу дзіцяці (*мал. 4, 5*).

Пасля адразання і перавязвання пупавіны дзіця купалі. Агульнабеларускі характар меў звычай класці ў ваду для першага купання хлеб, зерне, срэбраную манету, пярсцёнак, каб забяспечыць багатае жыццё дзіцяці. Большасць жа абрадава-магічных дзеянняў падзяляліся ў залежнасці ад полу дзіцяці. Так, пры купанні хлопчыка ў ваду дабаўлялі корань дзевясіла або некалькі кропель піва, каб ён быў моцны і здаровы, побач з купеллю клалі разнастайныя прадметы мужчынскай дейнасці; пры купанні дзяўчынкі у ваду дабаўлялі малако, каб яна была прыгожая і белатварая, а побач з купеллю клалі, адпаведна, прадметы жаночай дзейнасці. Пакупаўшы, хлопчыка павітуха загортвала ў споднюю сарочку маці, каб яго ў будучым любілі дзяўчаты, а дзяўчынку – ў бацькоўскія споднія нагавіцы, каб яе любілі хлопцы.

Пасля купання хлопчыка ваду выліваlі на вугал хаты ці пад дрэва, пасаджанае ў яго гонар,– дуб, ясень, клён, каб ён любіў родны дом і быў добрым гаспадаром, а калі купалі дзяўчынку – ваду вылівалі на ганак, каб яна, стаўшы дарослай, хутчэй выйшла замуж, ці пад дрэва, пасаджанае ў яе гонар,– каліну, рабіну, яблыню.

Управіўшыся з дзіцём, павітуха працягвала завіхацца каля парадзіхі. Звычаі і абрады, звязаныя з паследам («дзіцячым мест(–ц)ам», «дзіцячай пасцеллю»), былі заснаваны на перакананні, што дзеянні, якія здзяйсняліся з ім, могуць аказаць станоўчы або адмоўны ўплыў на дзіця, яго лёс, здароўе, характар. У беларусаў пасле акраплялі святой вадой, чыталі над ім малітвы і замовы, загортвалі ў кавалак тканіны разам з хлебам і соллю, зрэдку клалі цвік, аловак (пасле хлопчыка), іголку, нітку (пасле дзяўчынкі) і пасля закопвалі пад вугал хаты, пад печчу, пад сталом («на куце»), у каморы, пад жорны, у хляве, варыўні, у садзе пад фруктовае дрэва.

Спалі немаўлята ў люльках або калысках. Калыска была адна на ўсіх дзяцей, каб браты і сёстры сябравалі паміж сабой. Да яе адносіліся як да святой рэчы ў хаце (*мал. 6*).



*Мал. 4.* Традыцыйныя прылады мужчынскай працы. Фота Т. Кухаронак



*Мал. 5.* Традыцыйныя прылады жаночай працы. Фота Т. Кухаронак



*Мал. 6.* Калыска. Іванаўскі раён, Брэсцкая вобл. Фота Т. Кухаронак

Беларусы верылі, што ў тую хвіліну, як нараджаўся чалавек, ён атрымліваў сваю долю, а на небе загаралася новая зорка. Бачным знакам шчаслівага лёсу была так званая дзіцячая сарочка, гэта значыць перапонка на галаве, з якой нараджалася немаўля. Лічылася, што шчасце і дабрабыт не пакінуць такога чалавека ўсё яго жыццё, адсюль выраз: «нарадзіўся ў сарочцы/рубашцы». У панядзелак, паводле народных уяўленняў, з'яўляліся на свет няўмекі, у якіх усё з рук валілася. Беларусы былі перакананы, што чалавек, які нарадзіўся ў аўторак, пражыве доўгае і шчаслівае жыццё, будзе мець шанцаванне ў вытворчых справах. Тых, чый дзень нараджэння прыпадаў на сераду, чакаў неакрэслены лёс («ні тое, ні сёе»). Меркавалася, што дзіця, якое з'явілася ў чацвер, будзе вельмі працавітым, яно рана пачынала хадзіць, гаварыць, праяўляла кемлівасць і спрыт ва ўсіх справах. У некаторых лакальных традыцыях чацвер лічыўся самым шчаслівым днем для нараджэння хлопчыка. Пятніца прыносіла бацькам лайдакоў, злодзеяў і горкіх п'яніц, і, наогул, значылася нешчаслівым днём для нараджэння. Тыя дзеці, што нарадзіліся



*Мал. 7.* Цяганне бабы на баране ў час хрэсьбін. Фота Ю. Внуковіча

ў суботу, былі шчаслівымі і паспяховымі. У нядзелю ж з'яўляліся на свет самыя шчаслівыя людзі, якіх ва ўсіх справах чакалі шанцаванне і поспех.

У беларусаў здаўна з вялікай адказнасцю адносіліся да выбару імя для дзіцяці, бо ў народнай свядомасці з імем звязваліся далейшы лёс чалавека, яго шчаслівае ці, наадварот, нешчаслівае жыццё. Выбіраючы імя блізкага продка – дзядулі, бабулі, прадзядулі і іншых родных, якія валодалі станоўчымі чалавечымі якасцямі, блізкія імкнуліся тым самым паставіць дзіця пад ахову рода. Да абраду хрышчэння немаўля называлі «лялечка», «багданька», каб падмануць злыя сілы, якія маглі пашкодзіць немаўляці. Хрышчэнне ўключала ў сябе абавязковае наданне новаму хрысціяніну імя аднаго з праваслаўных ці каталіцкіх святых, свята ў гонар якога адзначаецца ў 8-дзённы тэрмін з дня нараджэння дзіцяці.

У хуткім часе пасля родаў да парадзіхі прыходзілі ў адведкі без запрашэння замужнія жанчыны. Паводле нормаў звычаёвага права, нельга было ісці да яе з пустымі рукамі, таму жанчыны прыносілі ёй самыя каларыйныя і смачныя стравы. Пры гэтым непажаданым лічылася цікавіцца здароўем дзіцяці, наогул падыходзіць і глядзець на яго, каб не сурочыць. Мужчынам і незамужнім дзяўчатам прыходзіць увогуле забаранялася.

Статус хросных бацькоў быў ганаровым і разглядаўся як акт вышэйшага даверу. У выпадку смерці кроўных бацькоў яны неслі адказнасць за дзіця. Запрашэнне ў кумы суправаджалася разнастайнымі магічнымі дзеяннямі. Так, той, хто запрашаў, не меў права садзіцца ў гэтым доме – інакш, лічылася, дзіця не будзе доўга хадзіць. Ніколі не бралі за кумоў бяздзетных людзей, а за куму – цяжарную жанчыну. Згодна з народнымі звычаямі, адмаўляцца ад кумаўства не раілася, хоць такія выпадкі зрэдку і здараліся. Замена кумоў адбывалася ў выпадку смерці аднаго з іх, доўгатэрміновага ад'езду, цяжарнасці кумы. Паўсюдна на Беларусі замянялі кумоў, калі папярэднія дзеці паміралі, для чаго бралі за кумоў выпадковых людзей («стрэчных», «збожжых», спатыканых»). Адбывалася гэта так: бацька немаўляці раніцай у дзень хрэсьбін выходзіў на перакрыжаванне дарог («на ростынькі») і першых сустрэчных мужчыну і жанчыну запрашаў у кумы. Звычайна ніхто не адмаўляўся, калі толькі ў людзей не было вельмі тэрміновай справы.
У дзень царкоўнага хрышчэння – абраду афіцыйнага далучэння нованароджанага да праваслаўнай ці каталіцкай веры, які адбываўся ў нядзелю праз 2–3 тыдні пасля нараджэння дзіцяці, адзначалі

хрэсьбіны, хрысціны, ксціны, радзіны – сямейную ўрачыстасць з нагоды нараджэння дзіцяці.

На хрэсьбіны па запрашэнню прыходзілі толькі замужнія жанчыны і жанатыя мужчыны. Жанчыны неслі разнастайныя прадукты харчавання, мужчыны – грошы. Хросных бацькоў разам з дзіцём, што вярталіся з царквы (касцёла), на ганку сустракалі родныя бацькі і госці. Бабка-павітуха была апранута ў вывернуты поўсцю наверх кажух, каб дзіця не баялася сурокаў. Хросныя аддавалі дзіця родным бацьку або маці са словамі: «На табе тваё ражонае, а наша хрышчонае». Пасля гаспадар запрашаў усіх за стол, на які падавалі стравы, прыгатаваныя гаспадыняй і прынесеныя гасцямі.

Спецыяльнай абрадавай стравай на хрэсьбінах была бабіна каша, якую з прасяных, ячных або грэцкіх круп варыла бабка-павітуха на малацэ, з яйкамі, цукрам, мёдам, маслам. Зверху кашу аздаблялі цукеркамі і кветкамі. Бабіну кашу падавалі пад канец святочнага застолля. Пасля жартоўнага «торгу» гаршок з кашай заставаўся таму, хто болей паклаў грошай (па традыцыі гэта рабіў кум). Ён частаваў разам з бабкай кожнага госця кашай і разбіваў гаршок на шчасце дзіцяці. У беларусаў на хрэсьбінах выконваліся абрадавыя хрэсьбінныя (радзінныя) песні, якія былі арганічна ўключаны ў ход сямейнай урачыстасці, папярэднічалі пэўнаму абрадаваму дзеянню або тлумачылі яго. На хрэсьбінах гучалі прыказкі, прымаўкі, выслоўі, жарты, разнастайныя пажаданні дзіцяці, яго бацькам, у якіх знайшлі адлюстраванне маральныя нормы і каштоўнасныя арыентацыі беларускага народа. Вялікае значэнне меў абмен падарункамі: ручнікамі, наміткамі, палатном, хлебам.

Хрэсьбіны на большай частцы тэрыторыі Беларусі (за выключэннем Заходняга Палесся) завяршаў спецыяльны абрад пад назвай «цягаць бабку на баране» (*мал. 7*). Госці выходзілі на двор, рыхтавалі санкі ці калёсы, на якія клалі зуб'ем уніз барану, засланую кажухом (у больш раннія часы выкарыстоўвалася толькі барана, пакрытая кажухом), садзілі бабку і везлі яе да карчмы або да хаты. Часам бабку ўпрыгожвалі каснікамі, пер'ем, у рукі давалі дубец, венік або чырвоную стужку. Госці пераапраналіся ў карнавальныя касцюмы «доктара», «салдата», жанчыны ў мужчынскае адзенне і наадварот, многія на галаву надзявалі рэшата, вымазвалі сабе твар сажай, ідучы па вуліцы, спявалі, крычалі, пляскалі ў далоні, стукалі палкамі ці качалкамі ў пустыя



**Мал. 8.** Печ, куды кідалі першы выпаўшы зуб.
Фота Т. Кухаронак

вёдры і г.п. У пачатку XX ст. замест бараны пачалі выкарыстоўваць каляскі, вазкі, санкі.

Дзіця падрастала з кожным днём, а ў бацькоў з'яўляліся новыя клопаты. Першы крок выклікаў у сям'і ўсеагульную радасць. У беларускіх сялян хто-небудзь са старэйшых, калі дзіця рабіла першы крок, браў нож ці іншы востры прадмет і праводзіў ім па падлозе паміж ножак дзіцяці («разразаў путы»). Інакш, паводле народнага меркавання, дзіця доўга будзе хадзіць няўпэўнена,валіцца на падлогу. Беларускія сяляне ўважліва сачылі за першым словам дзіцяці: калі яно было «тата», лічылася, што наступным у гэтай сям'і народзіцца хлопчык, калі «мама» – народзіцца дзяўчынка.

Пры з'яўленні ў дзіцяці першага зуба маці або бабуля саджалі яго ў рэшата і вазілі па падлозе, каб хутчэй раслі іншыя. Пры выпадзені малочнага зуба яго кідалі на печ або пад печ. Пры гэтым дарослыя гаварылі: «Мышка, мышка, на табе касцяны зуб, дай дзіцяці жалезны (у сэнсе моцны)» (*мал. 8*).

Больш урачыста ў сям'і адзначалася першае пастрыжэнне дзіцяці – стрыжкі, пастрыжыны, якое здзяйснялася пры спаўненні яму аднаго года. Паўсюль на Беларусі забаранялася кідаць састрыжаныя валасы абы-куды. Іх спальвалі ў печы, кідалі ў рэчку, затыкалі ў сцяну, бо, паводле народнага меркавання, калі валасы падыме птушка і саўе з імі гняздо, у чалавека ўсё жыццё будзе балець галава. У час пастрыжын дзіця абвязвалі чырвонай ніткай або да яго адзення прымацоўвалі мяшочак з соллю.

Такім чынам, звычаі, абрады, вераванні, што суправаджалі ў беларусаў нараджэнне дзіцяці і прыняцце яго ў сямейна-грамадскі калектыў, уяўлялі сабой цэласную сістэму, якая мела беспамылковы механізм адбору і захавання найбольш каштоўнага з усяго, што стыхійна стваралі народная філасофія, мастацтва, этыка, медыцына.